***Карпіевіч В.А.,*** *дацэнт кафедры гуманітарных навук Універсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ БУРЖУАЗІІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

# ECONOMIC CONDITIONS FOR THE FORMATION OF THE BOURGEOISIE IN BELARUS IN THE POST-REFORM PERIOD (SECOND HALF OF THE XIX CENTURY)

*У артыкуле разглядаюцца пытанні і ўмовы фарміравання буржуазіі ў Беларусі ў паслярэформенны перыяд. У першую чаргу акцэнт робіцца на эканамічныя ўмовы, якія ўзніклі пасля адмены прыгону. Разглядаюцца такія фактары, як будаўніцтва чыгунак, пераход да стацыянарнага гандлю, стварэнне фінансавых устаноў. Адзначаецца слабасць развіцця эканомікі, што тармазіла фарміраванне буржуазіі ў Беларусі ў другой палове XIX ст.*

***Ключавыя словы:*** *буржуазія, капіталістычная вытворчасць, эканамічныя ўмовы, рынак рабочых рук, чыгункі, перавозка грузаў, гандаль, фінансы, фінансавыя установы*

*The article discusses issues and conditions of the formation of the bourgeoisie in Belarus in the post-reform period. First of all, the emphasis is on the economic conditions that have arisen after the abolition of serfdom. Factors such as the construction of railways, the transition to stationary trade, the creation of financial institutions are considered. The weakness of economic development is noted, which hampered the formation of the bourgeoisie in Belarus in the second half of the 19th century.*

***Keywords****: the bourgeoisie, the capitalist mode of production, economic conditions, market labor, railways, freight transportation, trade, finance, financial institutions*

Буржуазія, якая ўжо ў сярэдзіне XIX ст. трымала ў сваіх руках буйныя грашовыя сродкі і сродкі вытворчасці, была таксама пануючым класам грамадства многіх краін Захаду. Гэта было абумоўлена тымі мадэрнізацыйнымі працэсамі, якія садзейнічалі пераходу шэрагу еўрапейскіх краін ад феадальнага, даіндустрыяльнага, грамадства да капіталістычнага, індустрыяльнага. У краінах з новай сістэмай грамадскіх адносін ствараліся новыя, інклюзіўныя, інстытуцыі, якія дазвалялі прадстаўнікам розных сацыяльных пластоў грамадства актыўна ўключацца ў сацыяльныя працэссы, у тым ліку – і доступ да ўдзелу ў дзяржаўным кіраванні.

Беларускія землі, якія ў гэты перыяд уваходзілі ў склад Расійскай імперыі, працягвалі адчуваць перажыткі мінулай эпохі, затрымліваліся ў сваім развіцці. Пэўныя хібы ў мадэрнізацыйных працэсах тармазілі фарміраванне тут новых пластоў грамадства. Буржуазія, якая займала пануючае становішча ў

такіх краінах як ЗША, Велікабрытанія, Францыя, у беларускіх землях толькі нараджалася, гэта адбывалася ва ўмовах панавання феадальнай гаспадаркі.

Капіталістычная вытворчасць базіруецца на працы вольнанаёмных рабочых. Ва ўмовах прыгоннай гаспадаркі рынак працы быў вельмі абмежаваны. Памешчыкі неахвотна адпускалі сваіх сялян для найму на прамысловыя прадпрыемствы. Таму галоўнай складаючай рынку свабодных рук было шматлікае яўрэйскае насельніцтва, а таксама пераведзеная ў мяшчанскае саслоўе частка былой шляхты.

Другой праблемай быў недахоп фінансавых сродкаў. Для таго, каб адчыніць прамысловае прадпрыемства, неабходна было мець дастатковую колькасць грашовых сродкаў. Фінансавы рынак беларускіх зямель у першай палове XIX ст. фактычна не існаваў. Адсутнічала як дзяржаўная падтрымка прамысловасці, так і прыватны капітал. Па сутнасці тут не існавала ў дадзены перыяд крэдытных устаноў. Беларускія памешчыкі самі мелі патрэбу ў грашовых сродках, а шматлікае і стракатае мясцовае гандлярства таксама было абмежавана ў магчымасці фінансаваць прадпрымальніцкую дзейнасць.

У першай палове XIX ст. мясцовая таварная вытворчасць заставалася набліжанай да натуральнай. Магчымасці таварнага рынку былі таксама абмежаванымі. Фактычна за межы беларускіх зямель вывозілася сыравіна, а нязначная колькасць вырабаў беларускіх прадпрыемстваў спажывалася ў асноўным на месцы. Гандаль на беларускіх землях быў у асноўным перыядычным, абмен таварамі адбываўся галоўным чынам пад час кірмашоў. Пастаянны стацыянарны гандаль фактычна яшчэ не быў развіты. У большай ступені прычынай гэтаму была адстутнасць развітой транспартнай інфраструктуры. Чыгункі на беларускіх землях з'явяцца толькі ў другой палове XIX ст., тавары ж галоўным чынам перавозіліся па рэках і гужавым транспартам. Адсутнасць транспартнай сістэмы таксама не лепшым чынам уплывала і на развіццё прамысловасці.

Такім чынам, слабасць эканамічнага развіцця беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. не стварала ўмоў для фарміравання мясцовай буржуазіі, а, па сутнасці, і ва ўсёй імперыі. Аднак мадэрнізацыйныя павевы патрабавалі правядзення ў краіне сацыяльна-эканамічных і прававых пераўтварэнняў.

У другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі адбываюцца значныя сацыяльна-прававыя падзеі, якія павінны былі даць магчымасць Расіі і ўсім падуладным ёй землям перайсці на новы этап свайго развіцця. Менавіта першым крокам сталі адмена прыгону ў 1861 г. і наступіпшыя за ёй буржуазныя рэформы.

Адмена прыгону павінна была вырашыць некалькі важнейшый праблем, звязаных з эканамічным развіццём краіны. Акрамя разгляду пытання аб зямлі, сялянская рэформа павінна была вырашыць пытанне фарміравання рынку рабочых рук. Але, паколькі рэформа праводзілася не ў інтарэсах сялян, а памешчыкаў, яна не дала таго эфекту, які чакаўся. Шматлікія абмежаванні не давалі магчымасці сялянам адразу атрымаць волю. Таму працэс стварэння рынку працы быў запаволены. Прамысловыя прадпрыемствы па-ранейшаму адчувалі недахоп рабочых, асабліва адукаваных і кваліфікаваных.

Між тым царскі ўрад быў вымушаны прымаць шэраг захадаў па развіцці краіны. Адным з важнейшых эканамічных мерапрыемстваў стала стварэнне сучаснай транспартнай сітэмы, таму што немалаважнае значэнне для развіцця прамысловасці адыгрывае стан шляхоў зносін і наяўнасць транспартных сродкаў. У другой палове XIX ст. у Беларусі пачалося чыгуначнае будаўніцтва. Першай чыгункай, якая прайшла ў 1862 г. праз тэрыторыю Беларусі (г. Гродна), была Пецярбург – Варшава. Да канца стагоддзя тут былі пабудаваны чыгункі: Рыга-Арлоўская (1866), Масква – Варшава (1871), Лібава-Роменская (1873), Палеская (1888), Вільна-Ровенская (1894) і іншыя.

Чыгуначныя шляхі спрыялі эканамічнаму развіццю Беларусі. Яны аказалі значны ўплыў на фарміраванне новых прамысловых цэнтраў. Не толькі такія буйныя гарады як Мінск, Віцебск, Гродна, Полацк станавіліся важнейшымі чыгуначнымі станцыямі, але ўзніклі новыя: Брэст, Баранавічы, Орша. У сваю чаргу Пінск, Бабруйск, Гомель былі не толькі буйнымі рачнымі прыстанямі, але сталі і буйнымі чыгуначнымі станцыямі.

Важнае значэнне набыла пасля свайго адкрыцця Рыга-Арлоўская чыгунка. У 1869–1872 гг. ад ст. Віцебск у сярэднім адпраўлялася 10 662,8 тыс. пудоў рознага грузу, ад ст. Полацк – 300,1 тыс., ад іншых станцый – 341,3 тыс. пудоў [1, ч. 2. Приложение. Табл. 9]. На працягу 1873–1879 гг. грузаабарот Дзінабургска – Віцебскага ўчастка Рыга-Арлоўскай чыгункі складаў у сярэднім штогод 43 314,6 тыс. пудоў, у 1880–1889 гг. – 41 080,4 тыс. У 1890 г. тут было перавезена толькі 29 221 тыс. пудоў, аднак хлебны груз складаў з іх 25 080 тыс., альбо 85,8 % ад агульнага [2, с. 341-345].

У 80-я гг. чыгункі сталі адыгрываць у грузаперавозках больш важную ролю, чым рэкі. Так, у 1884 г. ад чыгуначных станцый Магілёўскай губерні было адпраўлена 6570,6 тыс. пудоў грузу, ад прыстаняў – толькі 1887,6 тыс. На чыгуначныя станцыі губерні было прывезена 3068 тыс. пудоў грузу, а на прыстанях было разгружана толькі 1731 тыс. пудоў. Грузаабарот чыгункі перавысіў рачны ў 2,6 раза [3, с. 663-667]. У гэтым жа годзе па Дзінабургска-Віцебскай чыгунцы ў межах Віцебскай губерні было перавезена 43 523 тыс. пудоў грузу, а па Дзвіне грузілася і разгрузілася толькі 5244,3 тыс. пудоў [2, с. 341-345].

Асноўнымі таварамі, якія грузіліся на прыстанях беларускіх губерняў, былі хлеб і лес. Яны складалі асноўную частку вывазу беларускіх тавараў за межы губерняў. Прыкладна з кожнай беларускай губерні вывозілася ў сярэдзіне XIX ст. 150 – 200 тыс. чацвярцей хлеба, коштам ад 500 тыс. да 1 млн. руб. У той час як ільнянога семя вывозілася з Мінскай губерні на 90 тыс. руб., з Гродзенскай – на 60 тыс. руб. Лесу з Мінскай губерні па Дняпру штогод сплаўлялі на 650 тыс. руб., а з Гродзенскай – на 200 тыс. руб. да балтыйскіх портаў. Віно і некаторыя сельскагаспадарчыя тавары вывозіліся за іх межы ў невялікай колькасці. Завозіліся ж сюды хлеб, мэбля, прамысловыя вырабы, прадметы раскошы і моды, віна і каланіяльныя тавары [4, с. 66].

У 80 – 90-х гадах XIX ст. асноўны цяжар па перавозе грузаў кладзецца на чыгункі, якія перасякалі ўсе беларускія губерні, звязвалі іх з Санкт-Пецярбургам, Масквой, Рыгай, Варшавай ды іншымі гарадамі Расійскай імперыі, а таксама з замежнымі краінамі. Так, па Дзінабургска-Віцебскім участку Рыга-Арлоўскай чыгункі перавозілася ад 30 да 40 млн. пуд. [2, с. 341-

345] рознага грузу, а ў некаторыя гады і больш. Ад станцый Мінскай губерні па Лібава-Роменскай чыгунцы ў 1895 г. было адпраўлена 5378 тыс. пуд. розных тавараў, прычым большую палову складалі лес, лесаматэрыялы і дровы, па Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы – 2954 тыс. пуд., амаль палову грузу складаў хлеб, астатняе – лес, ад станцый Палескай чыгункі было адпраўлена 5929 тыс. пуд. [5, л. 570-574].

У сярэдзіне XIX ст. у многіх гарадах Беларусі ўжо дзейнічалі гандлёвыя лаўкі. Іх развіццё ішло як па экстэнсіўным шляху, так і па інтэнсіўным. Гэта адзначае, што ўжо напачатку 60-х гг. лаўкі існавалі ва ўсіх гарадах, у тым ліку – і ў заштатных, і іх колькасць пастаянна ўзрастала. У 1861 г. іх больш за ўсё было ў гарадах Магілёўскай – 1818 і Мінскай губерняў – 1576. У беларускіх гарадах Віцебскай губерні іх налічвалася 1007, а Гродзенскай – 935 [6]. На працягу другой паловы стагоддзя іх колькасць павялічылася. Аднак, лаўкі па сваіх памерах і абаротах былі неаднолькавымі. Іх абарот складаў ад некалькіх сотняў рублёў да дзесяткаў тысяч.

Абавязковая справаздача, якая была ўведзена для гільдзейскіх прадпрыемстваў з 1885 г. і для негільдзейскіх – з 1889 г., дазваляе нам атрымаць больш дакладныя звесткі аб развіцці ўнутранага гандлю ў Беларусі ў канцы XIX ст. У асноўным з 1885 па 1898 гг. у Беларусі назіралася павелічэнне гільдзейскіх прадпрыемстваў. Іх колькасць па беларускіх губернях узрасла за гэты час з 2464 да 3617, а абарот адпаведна з 23,5 тыс. рублёў да 59,3 тыс. [7, с. 11-17, 42-45, 86-93; 8, с. 47-48, 54, 65-66].

Аднак, нягледзячы на тое, што тэмпы росту колькасці гільдзейскіх прадпрыемстваў і іх гадавога абароту ў Беларусі былі даволі высокія, сярэдні гадавы абарот на адно прадпрыемства быў значна ніжэйшым чым у цэлым па Еўрапейскай Расіі. Так, у 1885 г. ён складаў у Беларусі 9,5 тыс. рублёў, а па Еўрапейскай Расіі – 46,4 тыс. [7, с. 11-17, 42-45, 86-93]. У 1898 г. сярэднегадавы абарот аднаго гільдзейскага гандлёвага прадпрыемства склаў адпаведна 16,4 тыс. і 61,9 тыс. рублёў [8, с. 47-48, 54, 65-66]. Гэта сведчыць аб тым, што ў Беларусі асноўную долю гільдзейскіх гандлёвых прадпрыемстваў складалі дробныя, з невялікім капіталам, і толькі адзінкавыя мелі гадавы абарот звыш 100 тыс. рублёў.

Гандлёвыя прадпрыемствы ў Беларусі былі разнастайнымі па характары прадаваемага ў іх тавару. Першынство сярод іх займалі разнастайныя гандлёвыя ўстановы, дзе прадавалі спіртныя напоі і закуску. Амаль у кожнай губерні яны складалі 1/3 частку ад усіх гандлёвых прадпрыемстваў. Значную частку складалі дробныя крамы, якія прапаноўвалі разнастайныя тавары, у тым ліку і прамысловыя. Але іх колькасць складала прыкладна каля 1/3 ад усіх гандлёвых прадпрыемстваў.

У канцы XIX ст. амаль уся тэрыторыя беларускіх зямель ўваходзіла ў Палескі эканамічны рэгіён. Беларускія паветы складалі тут 39 раёнаў з 56. На іх долю прыходзілася, прыкладна, ад 2/3 да 3/4 частак грузаабароту рэгіёна. Аднак, як сведчаць прыведзеныя ніжэй даныя, прадукты прамысловай вытворчасці складалі ў агульнай масе вывезеных тавараў значна менш за 1%. І толькі прадукцыя вінакурняў крыху перавышала 1%.

На першым месцы па вывазе тавараў з Палескага рэгіёна знаходзіліся лесаматэрыялы, іх вываз склаў 109,1 млн. пудоў, прычым 77,6 млн., альбо 71,1%, склаў будаўнічы лес. Прадуктаў земляробства было вывезена 6,9 млн. пудоў, з іх хлеба – 4,3 млн., ільну і пянькі – 34 тыс., бульбы – 162 тыс., садавіны і агародніны – 509 тыс., цукру – 684 тыс. Прадуктаў пераапрацоўкі карысных выкапняў вывезена 2,8 млн. пудоў, галоўным чынам, будаўнічыя матэрыялы – 1,6 млн. пудоў (57,6%), шкла і ганчарных вырабаў – 409 тыс. (14,6%), чыгуну, жалеза і сталі – 312 тыс. (11,1%), солі – 286 тыс. (10,2%). Далей ідуць прадукты вінакурства, якіх было вывезена 1196 тыс. пудоў. Прадуктаў жывёлагадоўлі было адпраўлена 736 тыс. пудоў, у тым ліку малочных, – 210 тыс.пудоў, мяса – 196 тыс., рыбы – 100 тыс., гарбарных тавараў – 88 тыс. Розных мануфактурных вырабаў было адпраўлена 106,3 тыс. пудоў. Акрамя гэтага было адпраўлена 242,5 тыс. пудоў мыла, свечак і запалак, 208 тыс. пудоў папярова-картонных вырабаў [9, с. 18-36].

Фактычна да канца 60-х гг. XIX ст. на беларускіх землях не існавала ніводнай крэдытнай установы. Беларускія губернатары неаднаразова звярталі ў сваіх справаздачах увагу на тое, што мясцовы крэдыт развіты тут вельмі слаба і не можа задавальняць патрэбы насельніцтва.

Першай мясцовай крэдытнай установай у Беларусі стаў Гомельскі гарадскі банк, які пачаў сваю дзейнасць у 1870 г. Услед за ім у 1873 г. быў заснаваны Мінскі камерцыйны банк. Адразу пасля свайго адкрыцця ён стаў адным з буйнейшых у Беларусі. Яго агульны абарот за 1874 г. склаў 6 025,5 тыс. рублёў, за 1875 – 4 880 тыс., за 1876 – 3 901 тыс. [10, за 1874 г., разд. I. С. 42; за 1875 г., разд. I. С. 28; 203, разд. I. С. 18]. Аднак першапачаткова дзейнасць банка была не зусім паспяховай. Праўленне вымушана было ў 1875 г. знізіць статутны капітал банка з 1,5 млн. рублёў да 1 млн. А потым – яшчэ прыкладна ў 2 разы [11, с. 31].

Прамысловы ўздым у канцы XIX ст. выклікаў павелічэнне попыту на грашовыя сродкі, што дазволіла Мінскаму камерцыйнаму банку пашырыць свае аперацыі і павялічыць свой асноўны капітал: у 1896 г. – да 750 тыс. рублёў, у 1897 – да 1 млн.

На працягу 1881-1884 гг. свае аддзяленні ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі адчыніў Дзяржаўны банк. Купцы і прамыслоўцы першапачаткова неахвотна карысталіся яго паслугамі. Так, у 1883 г. Мінскае аддзяленне Дзяржбанка выдала крэдыт 18 купцам, якія займаліся продажам сельскагаспадарчай прадукцыі. А на 1 студзеня 1890 г. тут атрымаў крэдыт 51 купец. На працягу 90-х гг. фінансавая дзейнасць аддзяленняў Дзяржбанка ў заходніх губернях узрасла [12, с. 162].

Такім чынам, сярод мясцовых фінансавых устаноў першае месца ў канцы стагоддзя займаў Мінскі камерцыйны банк. Яго паслугамі актыўна карысталася як мясцовае насельніцтва, так і жыхары іншых губерняў. У 1899 г. банк выдаў вэксаляў на суму 15,9 млн. рублёў, крыху менш, чым Мінскае аддзяленне Дзяржбанка. Пры гэтым было выдадзена пазык пад тавары на суму ў 10,2 млн. рублёў., а агульны прыбытак банка склаў 647,6 тыс. рублёў [13, отдел IV. С. 48-59].

Аперацыі іншых мясцовых банкаў былі значна ніжэйшымі. Так, трыма гарадскімі грамадскімі банкамі – Віцебскім, Гомельскім і Полацкім – было выдадзена вэксаляў на агульную суму ў 677,3 тыс. рублёў, а таксама пазык пад каштоўныя паперы на 76,5 тыс. і на 33,9 тыс. рублёў – пад каштоўныя рэчы і тавары [14, с. 452-463].

Таксама ў крэдытаванні пэўную ролю сталі адыгрываць і чыгункі, якія выдавалі пазыкі пад грузы, што перавозіліся па дарогах. Адным з першых у Беларусі такой дзейнасцю занялося праўленне Лібава-Роменскай чыгункі. У канцы 80-х гг. яно выдавала праз Мінскі камерцыйны банк пазыкі на перавозку хлебных грузаў, а затым і льняных. У 1894 г. было створана Лібаўскае камерцыйнае агенцтва, якое выдавала пазыкі пад здадзены ў яго магазіны хлеб [12, с. 164]. Аднак усё ж крэдытная дзейнасць чыгунак была абмежаванай.

Такім чынам, можна адзначыць, што эканамічныя ўмовы, якія існавалі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. не маглі садзейнічаць фарміраванню, у першую чаргу, прамысловай буржуазіі. Нягледячы на будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі сеткі чыгунак, яны не спрыялі развіццю прамысловасці. Прадпрымальнікам з ліку памешчыкаў і купцаў выгадней было вывозіць за межы беларускіх губерняў сыравіну (лес, будаўнічыя матэрыялы, збожжа і іншае), чым ствараць прадпрыемствы па іх перапрацоўцы і выпуску прамысловых вырабаў. Статыстыка вывазу тавараў яскрава аб гэтым сведчыць.

Пераход ад перыядычнага гандлю да стацыянарнага з’яўляўся важным крокам для развіцця гандлёва-прамысловай дзейнасці. Аднак статыстычныя даныя за гэты перыяд таксама нам паказваюць, што гандаль на беларускіх землях быў дробны, а, гэта значыць, што мясцовыя гандляры таксама былі абмежаваны ў сродках, якія маглі б быць накіраваны на развіццё гандлю і прамысловасці. Гэтую праблему не вырашалі і крэдытна-фінансавыя ўстановы, якія пачалі ўзнікаць на беларускіх землях у апошняй чвэрці XIX ст. Колькасць крэдытаў, іх маса і прыбыткі сведчылі аб тым, што яны не маглі вырашыць праблему з фінансаваннем прадпрымальніцкай актыўнасці, і як сведчанне таго, фарміраванне новага класса грамадства – буржуазіі. Гэты працэс быў на беларускіх землях запаволены. Таксама развіццю прамысловасці і фарміраванню буржуазіі не спрыялі і эканамічныя крызісы, якія негатыўна ўплывалі на эканамічнае жыццё беларускіх губерань, а таксама палітыка царызму, якая абараняла рускіх памешчыкаў і рускую буржуазію, часам за кошт інтарэсаў прадпрымальнікаў іншых частак імперыі.

Усе пералічаныя фактары стварылі ўмовы для фарміравання буржуазіі, аднак існуючыя недахопы не садзейнічалі дадзенаму працэсу. Не ўсе тыя асобы, якія змаглі наладзіць якую-небудзь прадпрымальніцкую дзейнасць, далучыліся да класа буржуазіі, таму што адсутнасць падтрымкі, у першую чаргу, з боку ўлад, прыводзіла іх да хуткага банкруцтва. Тым не менш, працэс фарміравання буржуазіі ў беларускіх губернях, хоць і павольна, але адбываўся.

1. Раевский, И. Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России / И. Раевски. – СПб.: Тип. бр. Пантелеевых, 1876. – Ч. 2: Район Западной Двины и верховьев Днепра. – 168 с.

2. Сапунов, А. Река Западная Двина / А. Сапунов. – Витебск: Тип. Г. Малкина, 1893. – IV, 512, LXIX, 28 с.

3. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. В 3-х кн. // Под ред. А. С. Дембовецкого. – Могилёв: Тип. губ. правл., 1884. – Кн. 2. – 1000 с.

4. Бобровский, П. Физические и нравственные элементы Северо-Западных губерний России /П. Бобровский // Вестник Западной России. – Т. 2. –Кн. 6. – Вильно, 1866. – Отдел III. С. 49-69.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 21. – Воп. 1. – Спр. 75.

6. Экономическое состояние городских поселений Европейской России в 1861 – 1862 гг. – СПб.: Тип. Вульфа, 1863. – Табліцы V, XI, XIX, XX.

7. Статистические результаты раскладочного и трехпроцентного сборов за 1885 г. – СПб.: Мин-во финансов, 1888. – 285 с.

8. Статистические результаты процентного и раскладочного сборов за 1896, 1897, 1898 гг. – СПб.: Мин-во финансов, 1900. – 221 с.

9. Торговля и промышленность Европейской России по районам: В 12 вып. – СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1901. – Вып. 11: Полесская зона. – 39, 86 с.

10. Отчеты по операциям акционерных банков коммерческого кредита за 1874 и 1875 гг. – СПб., 1877. – 406 с.

11. Акционерное дело в России. СПб.: Тип. М. М. Стасюкевича, 1897. – Вып. I. – Т. 2. – IV, 145 с.

12. Бейлькин, Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861 – 1914. /Х.Ю. Бейлькин. – Минск: Наука и техника, 1989. – 288 с.

13. Статистика краткосрочного кредита. Операции акционерных банков коммерческого кредита / Под ред. А. К. Голубева. – СПб.: Тип. В. Киршбаума, 1905. – 435 с.

14. Ежегодник Министерства финансов. – СПб., 1876. – Вып. VII. – 579 с.